УДК 355.233.231.1:821.161.3

# ФАРМІРАВАННЕ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ПАЗІЦЫІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ НАВУЧЭНЦАЎ У МЕЖАХ ЗНАЁМСТВА З ЛІРЫКАЙ ПАЭТА-ЗЕМЛЯКА АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА

А. В. ШАРАПАВА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілеў, Беларусь

**Анатацыя**. Даследуецца праблема фарміравання грамадзянска-патрыятычных якасцяў навучэнцаў установы адукацыі негуманітарнага профілю ў працэсе азнаямлення з творчасцю Аляксея Пысіна.

**Ключавыя словы**: выхаванне, патрыятызм, паэзія, паэт-зямляк.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі дэкларуе: «Мэтай выхавання з’яўляецца фарміраванне markdownрознабакова развітой, маральна сталай, творчай асобы навучэнца»[1] [2]. Першай жа задачай выхавання названы дакумент вызначае фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі [2]. У Канцэпцыі бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь усе складнікі выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі (ідэалагічнае, грамадзянскае і патрыятычнае, духоўна-маральнае, полікультурнае, эканамічнае і інш. [3]) арыентуюцца на фарміраванне ў навучэнцаў важных агульначалавечых каштоўнасцяў і разглядаюцца ў кантэксце зместу работы па грамадзянскім і патрыятычным выхаванні.

Рэалізацыя пастаўленых мэт рэгламентуецца таксама Падпраграмай 10 «Маладзёжная палітыка» Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» на 2021–2025 гг., у якой на першае месца ў ключавых напрамках дзейнасці вылучаецца «гераіка-патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі» [1]. План мерапрыемстваў па рэалізацыі асноўных напрамкаў выхавання навучэнцаў у Рэспубліцы Беларусь на 2021–2025 гг. адлюстроўвае магчымыя формы работы па дасягненні пастаўленых мэт і задач, сярод якіх «<…> актыўны ўдзел навучэнцаў у мерапрыемствах грамадзянска-патрыятычнай, гісторыка-краязнаўчай, ваенна-патрыятычнай накіраванасці, набыццё імі вопыту выражэння сваёй грамадзянскай пазіцыі; далучэнне навучэнцаў да нацыянальных традыцый, культурна-гістарычнай спадчыны беларусскага народа <…>» [5].

У Беларуска-Расійскім універсітэце фарміраванне грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму ў навучэнцаў адбываецца ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі. Для рэалізацыі выхаваўчых і ідэалагічных задач, асабліва ва ўмовах установы адукацыі негуманітарнага профілю, значныя магчымасці

[1] Тут і далей пераклад з рускай мовы аўтара – А. Ш.

маюць вучэбныя дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», «Беларуская мова (культура мовы)». Узаемадзеянне розных формаў і метадаў навучання на штотыднёвых занятках першакурснікаў, а таксама ў пазааўдыторны час дапаможа фарміраваць і развіваць у будучых спецыялістаў акадэмічныя, прафесійныя, сацыяльна-асобасныя, у тым ліку грамадзянска-патрыятычныя, кампетэнцыі і якасці.

У працэсе выхавання выкарыстоўваюцца разнастайныя формы і метады работы, праекты і мерапрыемствы, што структураваны на аснове дыдактычных прынцыпаў паслядоўнасці і сістэматычнасці, даступнасці і нагляднасці. Адной з форм работы, што рэалізуецца штогод, з’яўляецца святкаванне юбілеяў выдатных пісьменнікаў: М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, У. Караткевіча і інш. У той жа час актуальным бачыцца асэнсаванне жыцця і творчасці пісьменнікаў-землякоў, якое можна прымеркаваць да дня нараджэння аўтара, да Дня горада, Дня Перамогі і інш. Адной з выбітных асоб у шэрагу пісьменнікаў-землякоў з’яўляецца Аляксей Пысін (1920–1981), якому прысвячаецца аднайменны выхаваўчы праект.

Метад праектаў – дастаткова распаўсюджаная ў сучасны перыяд форма работы, якая прадугледжвае самастойную дзейнасць навучэнцаў па стварэнні канчатковага прадукту. Названы вышэй праект вызначаецца ў першую чаргу як творчы з элементамі даследчага і інфармацыйнага праектаў, ён «не мае дэталёва прапрацаванай структуры сумеснай дзейнасці ўдзельнікаў, яна толькі намячаецца і далей развіваецца, падпарадкоўваючыся пры гэтым жанру канчатковага выніку, абумоўленая гэтым жанрам і прынятай групай логікай сумеснай дзейнасці, інтарэсам удзельнікаў праекта» [4, с. 72]. Вядучая роля належыць мадэратару (выкладчыку, куратару), які вызначае мэту і задачы, рыхтуе план, правярае справаздачу па праекце і ацэньвае яго.

Мэта праекта – вызначыць магчымасці выкарыстання звестак пра жыццё і творчасць Пысіна ў працэсе патрыятычнага і духоўнага выхавання навучэнцаў. Задачы праекта: узгадаць ужо вядомыя і асэнсаваць новыя веды пра жыццё і творчасць паэта; распрацаваць карты / экскурсійныя маршруты (у тым ліку віртуальныя) па мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю Пысіна; паказаць, як у лірыцы адлюстравалася цесная сувязь паэта з родным краем; папулярызаваць яго асобу (у тым ліку праз сацыяльныя сеткі).

Справаздачай па праекце можа быць прэзентацыя «Жыццёвыя і творчыя шляхі Аляксея Пысіна», якую мэтазгодней паказаць у пазааўдыторны час. Пры ацэньванні работы выкладчык можа прыслухоўвацца як да меркаванняў саміх навучэнцаў, так і да прапаноў запрошаных на мерапрыемства гасцей.

Пры аповедзе пра жыццё Пысіна неабходна выкарыстаць геаграфічную карту з прыкладнымі маршрутамі юнацкіх, ваенных шляхоў паэта, указаннем гадоў, якія ён правёў у той ці іншай мясцовасці. Асобую ўвагу трэба надаць Магілёву і вобласці, каб праз пэўны топас вызначыць еднасць паэта і навучэнцаў. Важна ўзгадаць, што менавіта ў Магілёве і на Магілёўшчыне ён

напісаў практычна ўсе свае кнігі. Цікавым будзе ўключэнне слайдаў з выявамі мемарыяльнай дошкі ў гонар паэта, фотаздымкаў вуліцы, што носіць яго імя. Падобная форма работы спрыяе развіццю міжпрадметных сувязяў, актывізуе краязнаўчую дзейнасць маладых людзей, фарміруе іх патрыятычныя пачуцці.

Змястоўны аналіз паэзіі Пысіна [6] паказвае, што ў яго творчай спадчыне шырока прадстаўлена тэма малой радзімы. У адпаведнасці з мэтай і задачамі праекта можна засяродзіцца на наступных падтэмах.

1. Тапонімы і рэаліі Магілёўшчыны ў паэзіі А. Пысіна: «Першамайская вуліца», «За палямі лугі і лясы …», «Мой зялёны горад», «Краснаполле», «Магілёўская шаша», «Любуж», «Магілёўская гаворка», «Баркалабаўскія салаўі», «Дзявочая гара ў Мсціславе», «Пячэрскі парк», «Успомняцца – і адзавуцца …» і інш. 2. Гідронімы Магілёўшчыны ў паэзіі А. Пысіна: «Крэмень», «Сож», «Ручнікі», «Вяснянкі», «Карабельныя сосны», «Проня», «Раскінуў пляж дрымотныя пасцелі …» і інш. 3. Адлюстраванне ў паэзіі А. Пысіна ваенных падзей, што адбыліся на Магілёўшчыне ў розныя часы: «Помнік у Лясной», «Курганы», «Артылерыст Сірацінін», «Палім мы маршанскую махорку…», «Балада пра каску», «Магілёўскі шоўк», «Балада Буйніцкага поля» і інш. 4. Вершы А. Пысіна, прысвечаныя землякам: «Магілёўскія дзяўчаты», «Забыта многае ў жыцці …» (Сцяпану Гаўрусёву), «Лугоў зялёнае міжброўе …» (Міхасю Стральцову), «Сябры, з якімі развітаўся …» (памяці Івана Сіўцова), «Я ў Плёсах быў. Там клуб двухпавярховы…» (Міколу Аўрамчыку), «Пятрусь Бядулін», «Балада пра Фёдара Ракушава, запісаная ў вёсцы Ракушава Круглянскага раёна» і інш. 5. Вершы А. Пысіна, у якіх адлюстравалася беларуска-рускае памежжа, закранута праблема славянскай супольнасці і сяброўства: «Братэрства», «Побач з Расіяй», «Роздум», «Падмаскоўе», «Іван-чай», «Калінінскія сопкі» і інш.

Пры асэнсаванні лірыкі Пысіна можна выкарыстаць разнастайныя формы работы. Гэта могуць быць:

– невялікія паведамленні студэнтаў з аналізам верша, расповедам пра прататыпную аснову паэтычнага тэксту – асобу ці падзею;

– традыцыйны конкурс чытальнікаў;

– калектыўная прэзентацыя верша, калі ўся група чытае верш разам.

Мэтазгодна калектыўнае чытанне наладзіць на фоне тых мясцін, які апяваюцца ў вершы: на Першамайскай вуліцы, у Пячэрскім парку, у Любужы, на фоне Дняпра ці Дубравенкі. Такая цесная сувязь твора з рэльнасцю паказвае навучэнцам выдатны прыклад любові паэта да свайго горада, вучыць бачыць прыгожае і важнае ў штодзённым жыцці, фарміруе патрыятычныя пачуцці. Відэазапісы гэтых выступленняў змяшчаюцца ў прэзентацыю.

Метад праектаў найбольш прадуктыўны, калі новыя набытыя веды маюць практычнае прызначэнне, могуць дапагчы вырашыць пэўную жыццёвую праблему. Папулярызаваць горад Магілёў праз асобу Пысіна, стварыць

своесаблівы гарадскі брэнд – важнае грамадскае пытанне, якое можа захапіць навучэнцаў.

У сувязі з гэтым неабходна папулярызаваць названы праект. У сучасны перыяд зносіны перанесены ў сацыяльныя сеткі. Можна расказваць пра работу над праектам у адным ці некалькіх месэнджарах, у тым ліку на старонцы «Белорусский, русский и иностранные языки» у сацыяльнай сетцы ВКонтакте. Падбор візуальнага кантэнту, напісанне пастоў, адказы на каментарыі дазволяць навучэнцам набыць пэўныя прафесійныя навыкі. Найбольш цікавыя факты падобнай работы трэба захаваць праз скрыншоты старонак і таксама змясціць у выніковую прэзентацыю.

Ва ўмовах сучасных глабалізацыйных працэсаў выхаванне любові да сваёй Радзімы, веданне сваіх каранёў становіцца адной з вядучых педагагічных задач. Прапанаваная сістэма работы па асэнсаванні творчасці паэта-земляка Аляксея Пысіна мае важнае значэнне, бо дапамагае ажыццявіць выхаванне сацыяльна паспяховай і прафесійна кампетэнтнай асобы, спрыяе паслядоўнаму і актыўнаму садзейнічанню ў станаўленні грамадзяніна і патрыёта сваёй краіны.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Государственная программа «Образование и молодежная политика» на 2021–2025 годы [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3871&p0=C22100057. – Дата доступа: 02.10.2021.
2. Кодекс Республики Беларусь об образовании [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: http://pravo.by/document/?guid=3871&p0=hk1100243. – Дата доступа: 01.10.2021.
3. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь [Электронный ресурс] // Минский городской методический портал. – Режим доступа: http://mp.minsk.edu.by/ main.aspx?guid=6581. – Дата доступа: 01.10.2021.
4. Новые педагогические и информационные технологии в системе образования / Под ред. Е. С. Полат. – Москва: Академия, 2002. – 272 с.
5. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2021–2025 годы [Электронный ресурс] // Национальный образовательный портал. – Режим доступа: https://adu.by/images/2021/03/programma-vospitaniya-2021-2025.pdf. – Дата доступа: 03.10.2021.
6. **Пысін, А.** Выбраныя творы: у 2 т. / А. Пысін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 1. – 303 с.